УДК 347.7

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ КАНТРОЛЮ ЗА ЗАМЕЖНІКАМІ, ЯКІЯ ЎЯЗДЖАЮЦЬ У РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ ПРАЗ ДЗЯРЖАЎНУЮ МЯЖУ З РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫЯЙ

Ю. І. Міхнавец
аддзел унутраных спраў Салігорскага райвыканкама,
інспектар групы па рабоце з замежнымі грамадзянамі
і асобамі без грамадзянства аддзялення па грамадзянстве і міграцыі;
Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь,
ад'юнкт

Анатацыя. *У сучасным свеце адным з актуальных з'яўляецца пытанне барацьбы з незаконнай міграцыяй, такім чынам, пытанні кантролю за знаходжаннем замежнікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь таксама не губляюць сваёй актуальнасці. Для больш эфектыўнага процідзеяння з'яве незаконнай міграцыі на пастаяннай аснове распрацоўваюцца і прымяняюцца разнастайныя меры для недапушчэння незаконнай міграцыі.*

Ключевые слова: *грамадзянін, замежны грамадзянін, асоба без грамадзянства, замежнік, прававы рэжым, дзяржаўная мяжа.*

Annotation. *In the modern world, one of the urgent issues is the issue of combating illegal migration, thus, the issues of controlling the stay of foreigners in the territory of the Republic of Belarus also do not lose their relevance. In order to more effectively counter the phenomenon of illegal migration, various measures are being developed and applied on an ongoing basis to prevent illegal migration.*

Keywords: *citizen, foreign citizen, stateless person, foreigner, legal regime, state border.*

Замежныя грамадзяне (далей — ЗГ) і асобы без грамадзянства (далей — АБГ) прыбываюць у нашу краіну рознымі шляхамі, у тым ліку перасякаючы дзяржаўную мяжу з Расійскай Федэрацыяй.

Працягласць дзяржаўнай мяжы паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй складае 1 239 км, з іх 857,7 км сухапутнай, 362,3 км рачной і 19 км азёрнай [1].

Дзяржаўная мяжа паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй з'явілася ў 1991 г. у выніку распаду СССР, калі Беларуская ССР і РСФСР сталі асобнымі дзяржавамі.

Тэрыторыю беларуска-расійскай мяжы бесперашкодна могуць перасякаць толькі грамадзяне Саюзнай дзяржавы пры наяўнасці пашпартоў грамадзянскай прыналежнасці. Аднак па факце памежныя пункты і кантроль на мяжы, як з боку Расійскай Федэрацыі, так і з боку Рэспублікі Беларусь, адсутнічае. Гэта

значыць, што мяжа фармальна існуе, але на практыцы яе можна лёгка перасекчы без мытных праверак [2, с. 58].

На тэрыторыю нашай краіны ўязджаюць замежнікі з рознымі мэтамі: турыстычнымі, мэтамі працаўладкавання, пошуку прытулку і інш. Зыходзячы з меркаванняў забеспячэння нацыянальнай бяспекі і аховы грамадскага парадку, устанаўліваецца рэжым знаходжання ЗГ і АБГ у Рэспубліцы Беларусь [3, с. 120].

Такім чынам, ажыццяўленне эфектыўнага інтэграванага кіравання межамі і збалансаваная міграцыйная палітыка сёння з'яўляюцца аднымі з найважнейшых задач, якія патрабуюць, перш за ўсё, перагляду падыходаў да забеспячэння бяспекі дзяржаўнай мяжы і міграцыйнага рэжыму.

Так, паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 8 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян» ад 9 студзеня 2017 г., быў дазволены бязвізавы ўезд і часовае знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнікаў з 80 дзяржаў на тэрмін не больш за трыццаць сутак з дня ўезду [4].

Аднак гэтым дакументам была ўстаноўлена абавязковая ўмова перасячэння Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь: прыбыццё іншаземнага грамадзяніна ў Рэспубліку Беларусь павінна ажыццяўляцца праз пункт пропуску «Нацыянальны аэрапорт Мінск». На ўчастку мяжы з Расійскай Федэрацыяй кантроль за перасячэннем дзяржаўнай мяжы адсутнічаў, таму расійскі бок выказаў асцярогу, звязаную з магчымасцю незаконнага пранікнення з беларускага боку замежных грамадзян трэціх краін з недружалюбнымі намерамі. Так, у мэтах кантролю і бяспекі з 7 лютага 2017 г. была створана памежная зона з расійскага боку.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што на тэрыторыі Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй з моманту распаду СССР і да цяперашняга часу мяжы няма, яна носіць толькі фармальны характар, асабліва з боку Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым узнікаюць цяжкасці з ажыццяўленнем дэпартацыі альбо высылкі ў Расійскую Федэрацыю, а таксама кантролю за ЗГ і АБГ, якія перасякаюць ўчастак мяжы з боку Расійскай Федэрацыі.

Так, згодна з беларускім заканадаўствам, ЗГ і АБГ пры ўездзе ў Рэспубліку Беларусь абавязаны зарэгістравацца ў падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі (далей — ПГіМ) паводле месца свайго знаходжання альбо аформіць рэгістрацыю ў электроннай форме на Адзіным партале электронных паслуг на сайце portal.gov.by (дадзеная працэдура ажыццяўляецца бясплатна). Аднак карыстацца працэдурай рэгістрацыі ў электроннай форме могуць толькі замежнікі, якія заехалі праз афіцыйныя пункты пропуску праз Дзяржаўную мяжу

Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, ЗГ і АБГ, якія заехалі праз дзяржаўную мяжу з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, для афармлення рэгістрацыі павінны звяртацца асабіста ў ПГіМ паводле месца фактычнага знаходжання ў нашай краіне, што стварае некаторыя нязручнасці для ЗГ і АБГ.

Таксама падчас вядзення адміністрацыйнага працэсу ў супрацоўнікаў ПГіМ пры ўсталяванні дакладнай даты ўезду ЗГ і АБГ, якія парушылі дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, узнікаюць праблемныя пытанні па прычыне таго, што замежнікі, якія заехалі з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, імкнуцца ўтаіць рэальную дату перасячэння мяжы і такім чынам пазбегнуць адміністрацыйнага пакарання. З мэтай даказвання наяўнасці ў дзеяннях замежніка адміністрацыйнага правапарушэння, супрацоўнікам органаў унутраных спраў патрабуецца правесці вялікую старанную працу па зборы доказаў, якая не заўсёды можа прывесці да ўстанаўлення факта адміністрацыйнага правапарушэння.

У маі 2023 г. на шасці асноўных шляхах аўтамабільных зносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй органы пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь выставілі кантрольна-прапускныя пункты, супрацоўнікі пагранічнай службы правяралі дакументы, прастаўлялі адзнакі аб перасячэнні мяжы і заносілі адпаведную інфармацыю ў ведамасныя інфармацыйныя рэсурсы, што спрыяльным чынам паўплывала на ўзмацненне міграцыйнага кантролю.

Такім чынам, варта меркаваць, што даследаванне феномена рэжыму знаходжання замежнікаў у нашай краіне на сённяшні дзень з’яўляецца вельмі важнай праблемай, якая абумоўлена перш за ўсё канстытуцыйнымі прынцыпамі, у адпаведнасці з якімі чалавек, яго правы і свабоды з’яўляюцца найважнейшай каштоўнасцю.

Можна зрабіць выснову, што толькі пры ўмове стварэння надзейнага памежнага кантролю з боку Рэспублікі Беларусь могуць быць дасягнуты мэты эфектыўнага кантролю за ЗГ і АБГ, якія прыбываюць у Рэспубліку Беларусь з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі праз наземную дзяржаўную мяжу.

1. Российско-белорусская граница [Электронный ресурс] // Википедия : [сайт]. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/Российско-белорусская_граница (дата обращения: 19.02.2025). Перейти к источнику Вернуться к статье

2. Новикова А. А. Предупреждение правонарушений в сфере миграционного законодательства // Вестн. ЮУрГУ. Сер.: Право. 2012. № 29. С. 55–59. Вернуться к статье

3. Административно-правовые режимы Республики Беларусь / В. Ф. Ермолович, О. В. Кутилин, В. А. Рябоволов, Л. К. Фармагей. Минск : Акад. МВД, 2013. 291 с. Вернуться к статье

4. Об установлении безвизового порядка въезда и выезда иностранных граждан [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь от 9 янв. 2017 г. № 8 : в ред. от 14 сент. 2021 г. № 345. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН». Вернуться к статье